Palitsfera Working Papers No. 2/2026

# БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІТЫКА І КУЛЬТУРА Ў ГРАМАДСКАЙ ДУМЦЫ УКРАІНЫ

**Інстытут палітычных даследаванняў “Палітычная сфера”**

# Беларуская палітыка і культура ў грамадскай думцы Украіны

**Palitsfera Working Papers No. 2/2026**

Інстытут палітычных даследаванняў
“Палітычная сфера”

2026

# Беларуская палітыка і культура ў грамадскай думцы Украіны (2022–2025)

## Рэзюмэ

Саюзная падтрымка ўладаў Беларусі Расіі ў вядзенні вайны супраць Украіны значна змяніла стаўленне ўкраінскага грамадства як да беларускай дзяржавы і яе кіраўніцтва, так і да беларусаў увогуле. З 2022 года Інстытут «Палітычная сфера» ў межах беларуска-ўкраінскага экспертнага форуму імя князёў Астрожскіх праводзіць маніторынг грамадскай думкі Украіны, каб фіксаваць асноўныя тэндэнцыі і праблемы ў стаўленні да беларусаў і беларускай дзяржавы. Вынікі даследавання з'яўляюцца важнымі для разумення стану беларуска-ўкраінскіх адносін і перспектыў іх развіцця як ва ўмовах вайны, так і пасля яе верагоднага завяршэння. Даследаванне таксама ўключае параўнанне з падобнымі ўкраінскімі даследаваннямі, а таксама стаўленнем да Беларусі ў іншых краінах.

***Метады і часавыя рамкі даследавання.*** Метадам камп'ютарнага тэлефоннага інтэрв'ю (CATI) было праведзена тры хвалі даследавання: 2022 год (1026 рэспандэнтаў, 17–19 жніўня), 2023 год (1022 рэспандэнты, 14–16 кастрычніка) і 2025 год (1000 рэспандэнтаў, 13–23 кастрычніка). Памылка выбаркі 3,1% з верагоднасцю 0,95%. Даследаванне распрацавана, і дадзеныя прааналізаваны Інстытутам «Палітычная сфера». Інтэрв'ю ва Украіне праведзены ў супрацоўніцтве з даследчай кампаніяй InfoSapiens.

У межах даследавання задавалася пытанне пра агульнае стаўленне ўкраінцаў да беларусаў (грамадзян Беларусі),[1] якое дазваляе паказаць, як вайна змяніла традыцыйна пазітыўны вобраз беларусаў у вачах украінскага грамадства.

## Асноўны лініі падзелу ва украінскім грамадстве

Перад тым як перайсці да дэталёвага разгляду вынікаў даследавання, варта коратка апісаць асноўныя лініі падзелу ва ўкраінскім грамадстве, якія ўплываюць на пазітыўнае ці негатыўнае стаўленне да беларусаў і Беларусі.

З беларускай перспектывы вельмі важным з'яўляецца адрозненне прынамсі двух пазіцый: беларусы, якія падтрымліваюць палітыку беларускай і расійскай дзяржавы і беларусы, якія ставяцца да іх крытычна. Даследаванне паказвае, што толькі частка ўкраінцаў праводзіць такія адрозненні, для астатніх такіх адрозненняў не існуе і стаўленне да беларускай дзяржавы аўтаматычна накладаецца на стаўленне да ўсіх грамадзян Беларусі і, верагодна, нават да беларусаў, што жывуць ва Украіне.

***Фактары пазітыўнага і негатыўнага стаўлення.*** Якім жа чынам можна вызначыць профіль украінцаў, які ставяцца да беларусаў пазітыўна ці негатыўна?

*Узрост.* Людзі старэй за 50 год маюць значна больш сімпатый да беларусаў (+15,9 п.п.) чым людзі ва ўзросце да 39. Магчыма гэта звязана з іншымі інфармацыйнымі патокамі, альбо большым досведам пазітыўнага ўзаемадзеяння да вайны. З разыходжаннем знешнепалітычнага выбару апошнія 15-20 год сацыяльная дыстанцыя паміж краінамі расла і закранула малодшыя

1 Наша гіпотэза палягае на тым, што ў масавай свядомасці "беларусамі" украінцы ўспрымаюць усіх грамадзян Беларусі, а таксама ўсіх тых, хто ідэнтыфікуе сябе як беларусаў за мяжой. Фокус нашай увагі ў межах гэтага даследавання быў да першай групы – грамадзяне Беларусі.

ўзроставыя групы ў большай ступені. Свой уплыў мае і агульны савецкі досвед, з супольнай інфармацыйнай і культурнай прасторай. Але яго ўплыў не варта перабольшваць. Людзі ва ўзросце 50 на момант распаду СССР мелі толькі 15 год. Істотнай розніцы ўнутры групы (напрыклад 50-59 гадоў і 60+), не фіксуецца.

*Мова.* Рускамоўныя і двухмоўныя маюць значна больш пазітыўнае стаўленне да Беларусі: +19,9 п.п. у параўнанні з украінамоўнымі. Можна меркаваць, што ў рускамоўнай прасторы колькасць пазітыўных публікацый пра Беларусь (як афіцыйную, так і альтэрнатыўную) сустракаецца часцей, чым такія публікацыі на ўкраінскай мове.

*Фінансавы стан.* Фінансавы стан таксама выступае важным фактарам. Людзі з нізкімі і сярэднімі даходамі маюць больш пазітыўнае стаўленне (+13,3 п.п.), чым заможныя. Што магчыма тлумачыцца меншай цікавасцю першай групы да палітыкі, а таксама рознымі стратэгіямі інфармацыйнага спажывання.

***Рэгіён.*** Рэгіянальныя адрозненні патрабуюць больш асцярожнай інтэрпрэтацыі. У пытанні агульнага стаўлення да беларусаў гэты крытэрый, паводле дадатковых статыстычных праверак, не паказаў самастойнай значнасці: бачныя на першым этапе адрозненні ў значнай ступені тлумачацца рознай прадстаўленасцю моўных груп. Таму рэгіён не варта ўключаць у асноўны партрэт пазітыўнага або негатыўнага стаўлення да беларусаў нароўні з узростам, мовай і фінансавым становішчам.

Пры гэтым па шэрагу пытанняў пра беларускую знешнюю і ўнутраную палітыкі  адрозненні заўважныя. Найбольш устойлівы падзел праходзіць паміж Кіевам і Усходнімі абласцямі. У сталіцы рэспандэнты часцей даюць больш жорсткія і адназначныя ацэнкі: Беларусь як цалкам аўтарытарную дзяржаву апісваюць 79,1% апытаных у Кіеве супраць 40,6% на Усходзе. Беларусь як фактычна акупаваную Расіяй называюць 29,1% у Кіеве супраць 19,0% на Усходзе. Лукашэнку легітымным лідарам Беларусі лічаць толькі 0,7% рэспандэнтаў у Кіеве супраць 12,6% на Усходзе. Таксама Кіеў заўважна часцей дэманструе інфармаванасць пра беларускія падраздзяленні, якія ваююць на баку Украіны: 83,4% супраць 48,9% на Усходзе.

***Фактары, якія не ўплываюць: прамыя кантакты, знаёмства з беларускімі аўтарамі.*** Як ні дзіўна, але наяўнасць асабістых кантактаў з беларусамі практычна не ўплывае на стаўленне. Для тых, хто ацэньвае беларусаў пазітыўна, уключанасць у кантакты з беларусамі сапраўды крыху вышэйшая: 10,7% супраць 7,3% у сярэднім па ўсёй выбарцы. Розніца складае толькі +3,4 працэнтнага пункта, што нельга лічыць істотным тлумачэннем пазітыўнага стаўлення. Сярод негатыўна настроеных такія кантакты сустракаюцца радзей, 5,5%, але і тут адрозненне ад сярэдняга па выбарцы невялікае.

Асабліва важна, што 89,3% пазітыўна настроеных да беларусаў такіх кантактаў не маюць. Гэта значыць, што такое стаўленне ў большасці выпадкаў не вынікае з непасрэднага асабістага досведу зносін з беларусамі. Адначасова 94,5% негатыўна настроеных таксама не маюць такіх кантактаў, таму і адваротная пазіцыя найчасцей фарміруецца не праз асабісты досвед, а праз больш шырокі інфармацыйны, палітычны і культурны кантэкст. Статыстычная праверка паказвае, што сувязь паміж асабістымі кантактамі і стаўленнем да беларусаў існуе, але яна слабая.

Узровень інфармацыйнай уключанасці таксама істотна не ўплывае. Адказы на пытанне «Як часта вам сустракаюцца матэрыялы беларускіх аўтараў?» амаль не адрозніваюцца ў групах пазітыўна і негатыўна настроеных. Рэгулярны кантакт з такімі матэрыяламі, то бок мінімум раз

на месяц або часцей, маюць 27,8% у абедзвюх групах. Такім чынам, па гэтым паказчыку розніца паміж групамі фактычна адсутнічае.

Сярод іншых сацыяльна-дэмаграфічных характарыстык істотнага самастойнага ўплыву таксама не паказалі пол, памер населенага пункта, сямейны статус і колькасць дзяцей. Праверка гэтых паказчыкаў не выявіла ўстойлівых адрозненняў, параўнальных з узростам, мовай або фінансавым становішчам. Калі асобныя разыходжанні і з’яўляюцца, яны не фарміруюць самастойнага профілю пазітыўнага або негатыўнага стаўлення да беларусаў і, хутчэй за ўсё, звязаныя з іншымі характарыстыкамі рэспандэнтаў.

# Залежнасць палітычных ацэнак ад сімпатыі або антыпатыі да беларусаў

Стаўленне да беларусаў заўважна звязана з тым, як украінцы ацэньваюць сучасную палітычную сістэму Беларусі, ступень яе залежнасці ад Расіі і магчымую лінію Украіны ў дачыненні да беларускіх улад і дэмакратычнай апазіцыі. Пры гэтым гэтая сувязь не з’яўляецца простай і адназначнай. Нават сярод тых, хто ставіцца да беларусаў пазітыўна, большасць захоўвае крытычны погляд на беларускую дзяржаву, лічыць Беларусь аўтарытарнай і залежнай ад Расіі, а Аляксандра Лукашэнку не прызнае легітымным лідарам. Адрозненне паміж групамі праяўляецца перадусім не ў самім кірунку ацэнак, а ў ступені іх катэгарычнасці.

Найбольш гэта заўважна  ў ацэнцы палітычнай сістэмы Беларусі. Сярод негатыўна настроеных да беларусаў 69,3% лічаць Беларусь цалкам аўтарытарнай дзяржавай, тады як у супрацьлеглай групе гэты варыянт выбіраюць 50,1%. Калі аб’яднаць адказы пра цалкам і пераважна аўтарытарны характар дзяржавы, то аўтарытарнасць Беларусі прызнаюць 90,6% негатыўна настроеных і 73,9% пазітыўна настроеных. Гэта значыць, што крытычная ацэнка рэжыму дамінуе і сярод адных, і сярод другіх, але сярод негатыўна настроеных яна значна больш катэгарычная.

Аналагічная логіка праяўляецца і ў ацэнцы знешнепалітычнай самастойнасці Беларусі. І ў гэтым выпадку пераважае меркаванне пра моцную залежнасць Беларусі ад Расіі, аднак негатыўна настроеныя часцей выбіраюць больш жорсткія фармулёўкі. Сярод іх 41,6% лічаць, што Беларусь знаходзіцца пад поўным кантролем Расіі, і яшчэ 27,6% называюць яе фактычна акупаванай Расіяй. Сярод пазітыўна настроеных гэтыя паказчыкі ніжэйшыя: 31,3% і 22,3% адпаведна. Адначасова гэтая група часцей дапускае абмежаваную самастойнасць Беларусі: варыянт пра незалежную дзяржаву з істотна абмежаванай знешняй палітыкай выбіраюць 16,6% сярод пазітыўна настроеных  супраць 5,8% сярод супрацьлеглай групы.

Ацэнка легітымнасці Аляксандра Лукашэнкі таксама адрозніваецца паводле ступені жорсткасці. У абодвух сегментах большасць не лічыць яго легітымным лідарам Беларусі, які адлюстроўвае волю народа. Але сярод негатыўна настроеных адмоўныя адказы выяўленыя мацней: 65,1% выбіраюць адказ “не” і яшчэ 19,4% “хутчэй не”, сумарна 84,5%. Сярод пазітыўна настроеных адмоўныя ацэнкі таксама пераважаюць, але іх менш: 53,4% “не” і 15,7% “хутчэй не”, сумарна 69,1%. Пры гэтым доля тых, хто цалкам або часткова прызнае Лукашэнку легітымным, сярод пазітыўна настроеных вышэйшая: 21,9% супраць 12,5% сярод негатыўна настроеных.

Асабліва моцныя разыходжанні праяўляюцца ў пытанні пра тое, якую палітыку Украіна павінна праводзіць у дачыненні да Беларусі. Сярод негатыўна настроеных 36,6% выступаюць за

поўны разрыў адносін з беларускімі ўладамі, тады як сярод пазітыўна настроеных гэты варыянт выбіраюць толькі 12,1%. Розніца складае 24,5 працэнтнага пункта. Апошнія, наадварот, часцей падтрымліваюць кампрамісны або прагматычны падыход: 32,5% прапануюць шукаць кампраміс, а 18,2% лічаць магчымым падтрымліваць адносіны з Аляксандрам Лукашэнкам, калі гэта выгадна Украіне.

Пры гэтым падтрымка беларускай дэмакратычнай апазіцыі як альтэрнатывы цяперашняй уладзе амаль не адрозніваецца: 37,0% сярод пазітыўна настроеных і 36,3% сярод негатыўна настроеных. Гэта важны вынік: негатыўнае стаўленне да беларусаў узмацняе падтрымку жорсткага разрыву з беларускімі ўладамі, але само па сабе не азначае большай падтрымкі дэмакратычнай апазіцыі Беларусі.

Асобна варта разгледзець пытанне пра формы ўзаемадзеяння Украіны з беларускай дэмакратычнай апазіцыяй. Сярод негатыўна настроеных заўважна вышэйшая доля тых, хто ўвогуле не хоча развіваць кантакты з ёй на дзяржаўным узроўні: 25,7% супраць 9,8% сярод пазітыўна настроеных. Гэтая другая група часцей выбірае больш гнуткія формы ўзаемадзеяння: 17,6% падтрымліваюць усебаковае супрацоўніцтва і адкрытую падтрымку, а 26,9% выступаюць за развіццё кантактаў без публічнага афішавання. Сярод негатыўна настроеных часцей выбіраецца абмежаваны афіцыйны фармат кантактаў, 32,3%, а адкрытая падтрымка атрымлівае меншую падтрымку, 11,0%.

Інфармаванасць пра Святлану Ціханоўскую некалькі вышэйшая сярод пазітыўна настроеных, 71,9% супраць 65,7%, аднак у абодвух выпадках большасць пра яе чула. Веданне пра беларускія падраздзяленні, якія ваююць на баку Украіны, практычна не падзяляе групы: пра іх чулі 63,6% сярод негатыўна настроеных і 60,4% сярод пазітыўна настроеных. Веданне беларускіх культурных і гістарычных дзеячаў таксама не фарміруе заўважнай лініі падзелу: каля дзвюх трацін у кожнай з груп не ведаюць нікога з пералічаных у анкеце.

Такім чынам, сімпатыя або антыпатыя да беларусаў звязаная перадусім з успрыманнем знешняй і ўнутранай палітыкі Беларусі. Негатыўна настроеныя рэспандэнты часцей бачаць Беларусь як цалкам аўтарытарную, залежную ад Расіі дзяржаву і часцей падтрымліваюць жорсткі разрыў з беларускімі ўладамі. Пазітыўна настроеныя не адмаўляюць аўтарытарны характар рэжыму і залежнасць Беларусі ад Расіі, але часцей выбіраюць менш катэгарычныя ацэнкі і больш прагматычныя або кампрамісныя фарматы ўкраінскай палітыкі. Пры гэтым культурная абазнанасць, кантакт з беларускімі аўтарамі, веданне пра беларускіх добраахвотнікаў і нават асабістыя кантакты з беларусамі тлумачаць выяўленыя разыходжанні значна слабей, чым стаўленне да палітычнай сістэмы, Лукашэнкі, Расіі і фармату адносін паміж Украінай і Беларуссю.

# Залежнасць палітычных ацэнак ад сімпатыі або антыпатыі да беларусаў



## Палітычная сфера

### Зводная табліца па ключавых індыкатарах: адхіленне ад агульнай выбаркі

| Пытанне / індыкатар | Усе рэспандэнты | Пазітыўнае стаўленне: адхіленне ад усіх рэспандэнтаў | Негатыўнае стаўленне: адхіленне ад усіх рэспандэнтаў |
|---|---|---|---|
| B3. Беларусь з'яўляецца цалкам аўтарытарнай дзяржавай | **58,27%** | **-8,2 п.п.** | **+11,0 п.п.** |
| B4. Беларусь незалежная або часткова самастойная ў знешняй палітыцы | **13,45%** | **+8,6 п.п.** | **-6,3 п.п.** |
| B4. Беларусь пад поўным кантролем Расіі або фактычна акупаваная | **61,17%** | **-7,6 п.п.** | **+8,0 п.п.** |
| B5. Лукашэнка не легітымны або хутчэй не легітымны | **75,46%** | **-6,4 п.п.** | **+9,0 п.п.** |
| B6. Ведаюць або чулі пра Святлану Ціханоўскую | **65,99%** | **+5,9 п.п.** | **-0,3 п.п.** |
| B8. Цалкам спыніць адносіны з беларускімі ўладамі | **26,35%** | **-14,3 п.п.** | **+10,3 п.п.** |
| B8. Падтрымліваць адносіны з Лукашэнкам, калі гэта выгадна Украіне | **12,27%** | **+5,9 п.п.** | **-4,4 п.п.** |
| B8. Шукаць кампраміс паміж двума варыянтамі | **24,68%** | **+7,8 п.п.** | **-5,6 п.п.** |
| B9. Не развіваць кантакты з дэмакратычнай апазіцыяй на дзяржаўным узроўні | **18,43%** | **-8,6 п.п.** | **+7,3 п.п.** |
| B10. Асцярога рэакцыі Лукашэнкі і пагаршэння адносін | **14,7%** | **+16,4 п.п.** | **-2,2 п.п.** |
| B10. Няясная ступень уплыву Расіі на апазіцыю | **67,9%** | **-8,6 п.п.** | **+1,4 п.п.** |

*Паказаныя толькі індыкатары з найбольш заўважнымі адхіленнямі; адхіленні разлічаныя адносна ўсіх рэспандэнтаў.*

# Агульнае стаўленне да грамадзян Беларусі

Вынікі апытання паказваюць, што стаўленне да беларусаў, зафіксаванае адразу пасля пачатку вайны, з’яўляецца дастаткова стабільным і не зазнала істотных змен з лета 2022 года да восені 2025-га. Агульнае размеркаванне настрояў можна апісаць наступным чынам: станоўчае і ў асноўным станоўчае стаўленне да беларусаў захоўвае прыблізна траціна ўкраінскага грамадства (35–38%), пры гэтым цалкам станоўча ставіцца толькі 3–4%.

Цалкам негатыўна ставяцца да беларусаў менш за пятую частку рэспандэнтаў (14–17%), пры гэтым колькасць такіх адказаў крыху скарацілася з 2023 года. Хутчэй негатыўна ставіцца каля траціны (33–35%). Разам апошні дзве катэгорыі складаюць прыблізна палова грамадства.

Такім чынам, вайна нанесла значны ўдар па вобразе беларусаў ва Украіне, але сітуацыя далёкая ад поўнага негатыву. Прыблізна траціна грамадства захоўвае тыя ці іншыя сімпатыі да беларусаў, а негатыўнае стаўленне характэрна для каля паловы ўкраінцаў.




Малюнак 1. Як вы цяпер ставіцеся да беларусаў (грамадзян Беларусі)?

Даследаванне выявіла, што стаўленне да беларусаў у асноўным фарміруецца праз СМІ і папярэдні культурны і палітычны досвед. Гэта звязана ў тым, што інтэнсіўнасць непасрэдных кантактаў дастаткова нізкія. Для вызначэння гэтага ўзроўню ў 2025 годзе было ўведзена новае пытанне: *«Ці ёсць у вас сябры, сваякі, калегі і іншыя асобы (у Беларусі або з Беларусі, але якія цяпер жывуць у іншых краінах), з якімі вы падтрымлівалі кантакт прынамсі адзін раз за апошні год?»*. Станоўча на гэтае пытанне адказалі толькі 7,3% рэспандэнтаў. Такім чынам, персанальныя стасункі з беларусамі (як у краіне, так і за яе межамі) ахопліваюць вельмі нязначную колькасць украінцаў.




Малюнак 2. Ці ёсць у вас людзі з Беларусі, з якімі вы падтрымлівалі кантакт хаця б раз за апошні год? 2025

Беларускія аўтары ахопліваюць толькі невялікую частку ўкраінскай аўдыторыі. На пытанне *«Як часта вы сустракаецеся з матэрыяламі аўтараў беларускага паходжання на грамадска-палітычныя тэмы або на тэму культуру?»* каля 60% адказалі, што зусім не сустракаюць, альбо сустракаюцца з такімі матэрыяламі радзей, чым некалькі разоў на год. Адносна шчыльны кантакт з беларускім палітычным ці культурным кантэкстам падтрымлівае толькі каля 9%. Гэта таксама заўважная частка аўдыторыі, з якой можна працаваць беларускай супольнасці. Да 25% сутыкаецца з беларускім кантэнтам нерэгулярна і эпізадычна.




Малюнак 3. Як часта вам трапляюцца матэрыялы аўтараў беларускага паходжання на грамадска-палітычныя тэмы або пра культуру? 2025

# Беларусь як дзяржава

Важнай часткаю стаўлення грамадскай думкі Украіны з'яўляецца вобраз дзяржавы, у прыватнасці яе палітычнага ладу і знешняй палітыкі. У межах даследавання ў гэтай сферы задавалася два пытанні, адказы на якія прыведзены ніжэй.

### На ваш погляд, якое з наступных сцверджанняў больш праўдзівае?

Палітычная сфера

| Сцверджанне | 2025 (%) |
|---|---|
| Беларусь — цалкам дэмакратычная дзяржава | 2,32% |
| Беларусь — пераважна дэмакратычная дзяржава | 6,56% |
| Беларусь — пераважна аўтарытарная дзяржава | 22,24% |
| Беларусь — цалкам аўтарытарная дзяржава | 58,27% |
| Цяжка адказаць / адмова | 10,61% |

**Табліца 6. На ваш погляд, якое з наступных сцверджанняў больш праўдзівае?**

Ацэньваючы палітычны лад сучаснай Беларусі, абсалютная большасць украінцаў (58,27%) ахарактарызавалі яе як цалкам аўтарытарную дзяржаву, і яшчэ 22,24% апісалі як пераважна аўтарытарную. У той ці іншай ступені Беларусь як дэмакратычную дзяржаву ўспрымаюць не больш за 10% украінцаў. Таксама істотная доля апытаных лічыць Беларусь мяккім аўтарытарызмам (22,24%).

### На ваш погляд, якое з наступных сцверджанняў больш праўдзівае?

Палітычная сфера

| Сцверджанне | 2025 (%) |
|---|---|
| Беларусь — незалежная дзяржава, цалкам самастойная ў знешняй палітыцы | 3,38% |
| Беларусь — незалежная дзяржава, на знешнюю палітыку якой у значнай ступені ўплывае Расія | 10,07% |
| Беларусь — залежная дзяржава, знешнюю палітыку якой амаль цалкам вызначае Расія | 20,41% |
| Беларусь — залежная дзяржава, якая знаходзіцца пад поўным кантролем Расіі | 36,77% |
| Беларусь — дзяржава, фактычна акупаваная Расіяй | 24,4% |
| Цяжка адказаць / адмова | 4,98% |

**Табліца 7. На ваш погляд, якое з наступных сцверджанняў больш праўдзівае?**

Пры апісанні знешнепалітычнага становішча Беларусі ўкраінскую грамадскую думку можна лічыць не менш кансалідаванай. Абсалютная большасць, звыш 60%, лічыць залежнасць ад Расіі вельмі высокай. Пры гэтым 36,77% бачаць Беларусь як залежную дзяржаву, што знаходзіцца пад поўным кантролем Расіі, а яшчэ 24,4% — як фактычна акупаваную Расіяй дзяржаву. Яшчэ каля 20% лічаць, што пэўная аўтаномія застаецца, але Расія ўсё адно «практычна цалкам» вызначае знешнюю палітыку Беларусі.

Ва ўкраінскай інфармацыйнай прасторы дамінуюць наратывы пра несамастойнасць і высокую залежнасць Беларусі ад Расіі. Гэта можа станоўча ўплываць на стаўленне да беларусаў, бо дазваляе, прынамсі часткова, здымаць адказнасць за дапамогу ў агрэсіі. Асабліва гэта тычыцца наратыву "акупацыі". Але адначасова такія наратывы ставяць пад пытанне палітычную суб'ектыўнасць Беларусі і беларусаў.

Тым не менш, каля 10% лічаць Беларусь незалежнай дзяржавай, а 3% — нават цалкам незалежнай.

# Беларуская палітыка

Першае пытанне, якое задавалася ў межах маніторынгу, было звязана з тым, як украінцы ацэньваюць легітымнасці дзеючага беларускага кіраўніцтва. Легітымнасць у дадзеным выпадку разумеецца як тое, наколькі займанне пасады адпавядае дэмакратычным працэдурам (волевыяўленню) грамадзян Беларусі. Адпаведна, адказ на гэтае пытанне можа быць маркерам таго, наколькі ўкраінцы суадносяць палітыку сучаснай беларускай улады з падтрымкай і чаканнямі беларусаў як народа.

Гэта асабліва важна ў кантэксце таго, што многія гады да 2022-га А. Лукашэнка быў адным з самых папулярных замежных палітыкаў ва Украіне з вельмі высокім пазітыўным рэйтынгам. Пры тым, што агульная структура стаўлення да Лукашэнкі засталася (абсалютная большасць украінцаў катэгарычна не лічаць яго легітымным кіраўніком Беларусі), сітуацыя заўважным чынам змянілася на карысць прызнання яго легітымнасці. Колькасць людзей, якія не прызналі яго легітымным, скарацілася больш чым на 10%: з 68,1% да 57,6%. У асноўным гэта адбылося за кошт росту ўсіх іншых катэгорый, асабліва гатовых цалкам прызнаваць легітымнасць (з 5% да 9,45%), і росту менш катэгарычных адказаў «хутчэй так» і «хутчэй не» на 2–2,5%. Такім чынам, тое, што прайшоў час і падзеі 2020 года сышлі з інфармацыйнай прасторы, пазітыўна паўплывала на імідж беларускай улады, хоць гэта пакуль не тычыцца большасці ўкраінцаў.

### Ці лічыце вы Аляксандра Лукашэнку легітымным кіраўніком Беларусі, які адлюстроўвае народнае волевыяўленне?




Малюнак 4. Ці лічыце вы Аляксандра Лукашэнку легітымным кіраўніком Беларусі, які адлюстроўвае народнае волевыяўленне?

Што тычыцца альтэрнатыўных беларускіх палітычных сіл, то тэндэнцыя тут адваротная. На пытанне пра тое, “Ці ведаеце вы Святлану Ціханоўскую?” (найбольш вядомую на міжнароднай сцэне асобы беларускага дэмакратычнага руху) станоўча адказалі каля дзвюх трацін рэспандэнтаў. З 2022 па 2025 гады іх колькасць скарацілася больш чым на 10%: з 76,5% да 65,99%.

### Ці ведаеце вы Святлану Ціханоўскую, лідарку беларускай апазіцыі, якая супрацьстаяла Аляксандру Лукашэнку на выбарах 2020 года?




Малюнак 5. Ці ведаеце вы Святлану Ціханоўскую, лідарку беларускай апазіцыі, якая супрацьстаяла Аляксандру Лукашэнку на выбарах 2020 года?

Як ні дзіўна, але падобная тэндэнцыя закранула і беларускія ўзброеныя фарміраванні, якія ваююць на боку Украіны. Найбольш вядомы з іх — полк імя Каліноўскага. Калі ў 2022 годзе амаль 70% украінцаў ведалі пра існаванне і дзейнасць такіх фармаванняў, то ў 2023 годзе іх доля скарацілася да 62,16% і засталася прыблізна на такім жа ўзроўні да 2025-га (61,48%). Калі скарачэнне вядомасці С. Ціханоўскай адбывалася паступова, то для беларускіх узброеных

фармаванняў у публічнай прэзентацыі найбольш крытычным быў першы год, калі пасля першай інфармацыйнай хвалі і навізны прысутнасць беларусаў ва ўкраінскай інфармацыйнай прасторы значна скарацілася.

**Ці чулі вы пра беларускія падраздзяленні, якія цяпер ваююць на баку Украіны, у прыватнасці пра полк імя Кастуся Каліноўскага, «Пагоню» і іншыя?**




Малюнак 6. Ці чулі вы пра беларускія падраздзяленні, якія цяпер ваююць на баку Украіны, у прыватнасці пра полк імя Кастуся Каліноўскага, «Пагоню» і іншыя?

Асобны блок пытанняў быў прысвечаны таму, якую палітыку ўрад Украіны павінен, з пункту гледжання грамадскай думкі, праводзіць у дачыненні да беларускіх улад і альтэрнатыўных палітычных сіл.

Пры адказе на пытанне пра палітыку, якую мусіць выбраць Украіна ў дачыненнях з афіцыйнымі ўладамі Беларусі, дазвалялася некалькі варыянтаў адказу. У параўнанні з папярэднімі гадамі апытаныя значна часцей сталі выбіраць толькі адну опцыю, таму сумарная колькасць адказаў скарацілася са 134,5% да 108,9%, што можна лічыць прыкметай кансалідацыі меркаванняў. Скарачэнне адбывалася найперш за кошт значнага падзення выбару опцыі «цалкам спыніць адносіны з уладамі Беларусі». Асабліва прыкметна гэта паміж 2023 і 2025 гадамі, а ў цэлым з 2022 па 2025 год доля тых, хто выбіраў гэтую опцыю, скарацілася больш чым у два разы: з 57,91% да 26,35%.

## Якую палітыку Украіна павінна праводзіць у дачыненні да Беларусі?

Палітычная сфера

| Варыянт адказу | 2022 | 2023 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Цалкам спыніць адносіны з уладамі Беларусі | 57,91% | 49,19% | 26,35% |
| Падтрымліваць адносіны з Аляксандрам Лукашэнкам, калі гэта выгадна | 3,52% | 4,77% | 12,27% |
| Шукаць кампраміс паміж двума названымі варыянтамі | 27,79% | 27,76% | 24,68% |
| Падтрымліваць беларускую дэмакратычную апазіцыю як альтэрнатыву цяперашняй уладзе ў Беларусі | 37,89% | 31,50% | 35,43% |
| Цяжка адказаць / адмова | 7,42% | 9,32% | 10,18% |
| **Усяго** | 134,53% | 122,53% | 108,91% |

**Табліца 8. Якую палітыку Украіна павінна праводзіць у дачыненні да Беларусі?**

Гэта, імаверна, тлумачыцца двума фактарамі. Па-першае, разрыў стасункаў ужо стаў відавочным фактам двухбаковых адносін, таму яго перасталі ўспрымаць як неабходны і тэрміновы крок. Па-другое, можна казаць пра рост у асобных сегментах украінскага грамадства агульнага станоўчага стаўлення да ўлад Беларусі і перспектыў аднаўлення супрацоўніцтва. У прыватнасці, колькасць тых, хто выступае за падтрыманне адносін з Аляксандрам Лукашэнкам, «калі гэта выгадна», складала ў 2022 годзе толькі 3,5% украінцаў, а ў 2025 годзе іх колькасць вырасла. Колькасць жадаючых шукаць кампраміс паміж жорсткай і мяккай лініяй засталася прыкладна на ўзроўні адной чвэрці, хоць і з пэўнай тэндэнцыяй да зніжэння — з 27,8% да 24,7%.

Што тычыцца дэмакратычнай апазіцыі, то тут нельга лічыць украінскае грамадства кансалідаваным, і тэндэнцыі за вызначаны перыяд былі рознанакіраванымі. З аднаго боку, заўважна скарацілася працэнт тых, хто супраць развіцця кантактаў з беларускай апазіцыяй на дзяржаўным узроўні: з 25,6% да 18,4%. Колькасць тых, хто падтрымлівае ідэю развіцця толькі афіцыйных кантактаў на ўзроўні сустрэч і заяў, спачатку заўважна з знізілася (з 24,1% да 14,5%), але да 2025 года вырасла да 29,4%.

### Якую палітыку Украіна павінна праводзіць у дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі Беларусі?

Палітычная сфера

| Варыянт адказу | 2022 | 2023 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Не развіваць кантакты на дзяржаўным узроўні | 25,61% | 27,84% | 18,43% |
| Развіваць кантакты на дзяржаўным узроўні, але абмежаваць іх афіцыйнымі сустрэчамі і заявамі | 24,06% | 14,45% | 29,4% |
| Развіваць усебаковае супрацоўніцтва і аказваць адкрытую падтрымку | 18,36% | 22,60% | 14,08% |
| Развіваць кантакты на дзяржаўным узроўні, але не афішаваць іх | 12,7% | 16,26% | 22,03% |
| Цяжка адказаць / адмова | 19,27% | 18,85% | 16,06% |

Табліца 9. Якую палітыку Украіна павінна праводзіць у дачыненні да дэмакратычнай апазіцыі Беларусі?

Вырасла колькасць тых, хто выступае за развіццё выключна нефармальных кантактаў на непублічным і неафіцыйным узроўні: з 12,7% да 22,0%. Можна канстатаваць, што падтрымка ідэі ўсебаковага супрацоўніцтва з аказаннем афіцыйнай і публічнай падтрымкі вырасла з 18,4% у 2022 годзе да 22,6% у наступным, але абвалілася да 14,1% да 2025 года.

У цэлым можна сказаць, што грамадская думка Украіны знаходзіцца на баку развіцця супрацоўніцтва ўкраінскай дзяржавы з беларускімі дэмакратычнымі сіламі, але пераважна на сімвалічным, а таксама нефармальным і непублічным узроўнях. Колькасць тых, хто падтрымлівае ідэю аказання ўсебаковай публічнай падтрымкі з боку дзяржавы, застаецца невялікай.

# Культурны вакуум

Апошняе пытанне тычылася абазнанасці ўкраінскай грамадскасці ў фактах беларускай культуры, а больш дакладна — таго, наколькі ўкраінцы ведаюць важных беларускіх культурных і палітычных дзеячаў, а таксама прадстаўнікоў сучаснай літаратуры.

### Каго з наступных беларускіх дзеячаў культуры вы ведаеце?

Палітычная сфера

| Асоба / варыянт адказу | 2025 |
|---|---|
| Ефрасіння Полацкая | **2,75%** |
| Францыск Скарына | **4,38%** |
| Канстанцін (Кастусь) Каліноўскі | **20,94%** |
| Якуб Колас | **7,5%** |
| Янка Купала | **12,67%** |
| Уладзімір Караткевіч | **5,24%** |
| Святлана Алексіевіч | **4,15%** |
| Усяслаў Полацкі (Чарадзей) | **2,76%** |
| Нікога не ведаю | **64,99%** |
| Цяжка адказаць / адмова | **0,73%** |

**Табліца 10. Каго з наступных беларускіх дзеячаў культуры вы ведаеце?**

Спіс быў складзены такім чынам, каб асобы маглі быць вядомымі ўкраінскай аўдыторыі альбо з кантэксту сумеснай даўняй гісторыі (Усяслаў Чарадзей, Еўфрасіння Полацкая), альбо праз літаратурныя і культурныя кантакты савецкага і постсавецкага перыяду (У. Караткевіч, Я. Купала, Я. Колас, Ф. Скарына), альбо праз сучасную літаратуру (С. Алексіевіч) ці актуальныя палітычныя падзеі (К. Каліноўскі).

Вынікі паказалі ўвогуле вельмі кепскае веданне ўкраінцамі беларускага культурнага і літаратурнага кантэксту. 64,99% адказалі, што яны не ведаюць ніводнага з прапанаваных дзеячоў беларускай культуры, палітыкі і літаратуры.

Самым папулярным сярод вядомых аказаўся Кастусь Каліноўскі (20,9%), але гэта відавочна звязана не з глыбокім веданнем гісторыі паўстання 1863–1864 гадоў, а з дзейнасцю палка імя Каліноўскага ў складзе Узброеных сіл Украіны.

На другім месцы апынуўся беларускі паэт Янка Купала (12,7%), што можа быць звязана з яго прысутнасцю ў савецкай школьнай праграме, а магчыма, і з нейкімі іншымі культурнымі згадкамі. Таксама крыху больш за астатніх у якасці вядомага быў пазначаны паэт і празаік Якуб Колас (7,5%), магчыма, па тых жа самых прычынах. Вядомасць усіх іншых палітычных і культурных дзеячаў, уключаных у спіс (у тым ліку і лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі па літаратуры Святланы Алексіевіч), укладаецца ў дыяпазон 2,7%–4,4%. Гэта значыць, што яны знаходзяцца амаль на мяжы статыстычнай пагрэшнасці. Усё гэта дэманструе невысокую рэпрэзентацыю беларускай гісторыі, культуры і літаратуры ва ўкраінскай інфармацыйнай і адукацыйнай прасторы — культурную непрыкметнасць. Беларусь успрымаецца ўкраінцамі як з’ява часцей палітычная, але не як самабытная культура.

# Параўнанне з падобнымі даследаваннямі ва Украіне.

Даследаванне грамадкай думкі Украіны ў дачыненнях да Беларусі праводзіцца рознымі даследчымі групамі. Яны выкарыстоўваюць розную метадалогію, якая не супадае з нашай, але

дапаўняе разуменне грамадскай думкі Украіны новымі аспектамі. На нашу думку важна прывесці кароткае апісанне гэтых даследаванняў для павышэння глыбіні аналізу праблемы.

Уласнае даследаванне "Палітычнай сферы" дадае да гэтага блоку асобны ракурс: яно не толькі фіксуе стаўленне да Беларусі як дзяржавы, але і асобна аналізуе стаўленне да грамадзян Беларусі, а таксама да беларускіх улад, дэмакратычнай апазіцыі, беларускіх добраахвотнікаў і культурнай прысутнасці беларусаў ва ўкраінскай прасторы. Гэта дазваляе лепш зразумець, дзе менавіта праходзіць мяжа паміж негатыўным стаўленнем да беларускай дзяржавы і стаўленнем да беларусаў як да людзей.

***Цэнтр эканамічных і палітычных даследаванняў ім. Разумкова.*** Цэнтр Разумкова згадвае Беларусь часцей за ўсё ў кантэксце пытання пра пазітыўнае ці негатыўнае стаўленне да асобных краін.[2] Апублікаваны вынікі прынамсі чатырох хваляў з гэтым пытаннем (сакавік 2021[2], красавік 2023[2], люты 2024[3] і кастрычнік 2024 года[4]).

Як паказваюць вынікі, большасць украінцаў пазітыўна ставілася да Беларусі ў 2021 годзе, то бок да пачатку поўнамаштабнай вайны Расіі супраць Украіны. Сумарная доля пазітыўных ацэнак складала 58,4% супраць 31% негатыўных.

Ужо да красавіка 2023 года трэнд змяніўся на супрацьлеглы. Доля пазітыўных адказаў знізілася да 12,4%, то бок амаль у 5 разоў. Доля негатыўных ацэнак вырасла больш чым у 2,5 раза, да 80,7%, што можна трактаваць як новы кансэнсус. Пік ахаладжэння прыйшоўся на люты 2024 года: пазітыўную ацэнку далі толькі 7,9% рэспандэнтаў. Колькасць тых, хто не вызначыўся, у параўнанні з 2021 годам таксама знізілася ўдвая, што ўскосна пацвярджае замацаванне гэтай тэндэнцыі.

Такім чынам, поўнамаштабная вайна надзвычай моцна паўплывала на стаўленне ўкраінцаў да Беларусі, не проста пагоршыўшы яго, але фактычна змяніўшы на супрацьлеглае. Вынікі кастрычніка 2024 года пацвярджаюць папярэднія высновы: доля пазітыўных ацэнак не перавышае 10%, а негатыўныя ацэнкі па-ранейшаму вышэйшыя за 80%.

У параўнанні з дадзенымі Цэнтра Разумкова наша даследаванне паказвае менш радыкальную карціну, калі пытанне фармулюецца не пра Беларусь як дзяржаву, а пра беларусаў як грамадзян. У даследаваннях Разумкова пасля 2022 года негатыўнае стаўленне да Беларусі як краіны перавышае 80%, тады як у нашым маніторынгу негатыўнае і хутчэй негатыўнае стаўленне да грамадзян Беларусі складае каля паловы рэспандэнтаў. Гэта пацвярджае, што

2 Пытанне, якое задавалася рэспандэнтам, было закрытым і прадугледжвала пяць варыянтаў адказу: «цалкам станоўчае, пераважна станоўчае, пераважна адмоўнае, цалкам адмоўнае, цяжка адказаць». [https://razumkov.org.ua/napriamky/sotsiologichni-doslidzhennia/zovnishnopolitychni-oriientatsii-gromadian-ukrainy-otsinka-zovnishnoi-polityky-vlady-stavlennia-do-inozemnykh-derzhav-ta-politykiv-liutyi-berezen-2023r]

3 Цэнтр Разумкова, «Ацэнка грамадзянамі знешняй палітыкі ўлады, эфектыўнасці міжнароднай падтрымкі і ўплыву знешнепалітычных чыннікаў на Украіну», студзень 2024 г.[https://razumkov.org.ua/napriamky/sotsiologichni-doslidzhennia/otsinka-gromadianamy-zovnishnoi-polityky-vlady-efektyvnosti-mizhnarodnoi-pidtrymky-ta-vplyvu-zovnishnopolitychnykh-chynnykiv-na-ukrainu-sichen-2024r]

4 Цэнтр Разумкова, «Падтрымка грамадзянамі ўступлення Украіны ў Еўрапейскі Саюз і НАТА. Стаўленне да замежных дзяржаў. Стаўленне да мірных перамоваў», верасень 2024 г. [https://razumkov.org.ua/napriamky/sotsiologichni-doslidzhennia/pidtrymka-gromadianamy-vstupu-ukrainy-do-yevropeiskogo-soiuzu-ta-nato-stavlennia-do-inozemnykh-derzhav-stavlennia-do-myrnykh-peregovoriv-veresen-2024r]

частка ўкраінцаў усё яшчэ адрознівае беларускую дзяржаву і беларускае грамадства, нават калі агульны фон успрымання Беларусі застаецца вельмі негатыўным.

***Сацыялагічная група “Rating”*** таксама публікавала дадзеныя пра стаўленне ўкраінцаў да Беларусі. У прыватнасці, з 2014 па 2018 год рэгулярна задавалася пытанне пра “цёплае” або “халоднае” стаўленне да краіны. “Халоднае” стаўленне было характэрнае толькі для 3–9% украінцаў, “цёплае” — для 39–56%. Дынаміка была звязаная галоўным чынам з выказваннямі і пазіцыяй А. Лукашэнкі адносна супрацьстаяння Украіны і Расіі, аднак “цёплае” стаўленне выразна дамінавала[5].

У апытаннях 2018–2022 гадоў таксама задавалася пытанне пра стаўленне да грамадзян Беларусі, што дазваляе прааналізаваць уплыў вайны ва Украіне. Калі да вайны “цёплае” стаўленне знаходзілася на ўзроўні 73–67%, “нейтральнае” — 25–27%, а “халоднае” — 2–4%, то пасля лютага 2022 года сітуацыя змянілася кардынальна[6].

Узровень “цёплага” стаўлення знізіўся да 22% вясной 2022 года і да 10% да восені таго ж года, а “халоднае” стаўленне вырасла спачатку да 33%, а пазней да 52%.[6]. Цікава, што значная частка рэспандэнтаў зрушваецца ў “нейтральную” пазіцыю: у красавіку 2022 года яна дасягае 42%, а ў жніўні застаецца на ўзроўні 34%[6]. Такім чынам, рэакцыя на вайну выяўляецца не толькі ў росце негатыўнага стаўлення, але і ў заўважным павелічэнні долі няпэўнага або стрыманага ўспрымання[6].

Іншымі словамі, вайна кардынальна закранула і адносіны паміж жыхарамі дзвюх краін. Гэты вывад пацвярджаецца яшчэ адным апытаннем ад сакавіка 2022 года. Пытанне гучала так: “А як наконт Беларусі: вінаватая толькі ўлада Беларусі або ў роўнай ступені і ўлада, і народ Беларусі?” 70% украінцаў абвінавацілі толькі беларускую ўладу, і толькі 24% адказалі: “і ўлада, і народ”[7].

Дадзеныя Rating важныя для супастаўлення з нашым даследаваннем, таму што яны таксама паказваюць розніцу паміж стаўленнем да Беларусі як краіны і стаўленнем да грамадзян Беларусі. Нашы вынікі 2025 года пацвярджаюць, што пасля першага шоку вайны стаўленне да беларусаў як да грамадзян стабілізавалася ў больш складанай канфігурацыі: каля траціны ўкраінцаў захоўваюць станоўчае або хутчэй станоўчае стаўленне, каля паловы ставяцца негатыўна або хутчэй негатыўна, а частка застаецца ў няпэўнай пазіцыі.

Апошняя значная група даследаванняў утрымлівала пытанне пра адносіны паміж дзяржавамі. Нават да пачатку вайны грамадзяне Украіны не лічылі Беларусь сваім знешнепалітычным саюзнікам. У красавіку 2021 года сумарная доля пазітыўных ацэнак (“адназначна саюзная” і

5 Сацыялагічная група «Рэйтынг», «Дынаміка грамадска-палітычных поглядаў ва Украіне», 15–31 сакавіка 2018 г. [https://cdn.prod.website-files.com/685c279caf66f4023ad2cab4/696e0fbffb9e5e8b27610b36_2018_03-national_ua-official_compressed.pdf]

6 Сацыялагічная група «Рэйтынг», «Сямнаццатае агульнанацыянальнае апытанне: ідэнтычнасць, патрыятызм, каштоўнасці», 17–18 жніўня 2022 г. [https://cdn.prod.website-files.com/685c279caf66f4023ad2cab4/68da4334e57b686729229f16_rg_ua_1000_independence_082022_xvii_press_compressed.pdf]

7 Сацыялагічная група «Рэйтынг», «Агульнанацыянальнае апытанне: Украіна ва ўмовах вайны», 1 сакавіка 2022 г. [https://cdn.prod.website-files.com/685c279caf66f4023ad2cab4/68da4aaf76bcda200408e9e3_rg_ua_1200_032022_ru_bl_compressed.pdf]

"хутчэй саюзная") складала толькі 30%, тады як негатыўных ("хутчэй варожая" і "адназначна варожая") — 22%. Пры гэтым найбуйнейшай катэгорыяй заставаліся нейтральныя ацэнкі — 43%[8].

У даследаванні за снежань 2021 года гэтая дынаміка ўзмацняецца: доля пазітыўных адказаў зніжаецца да 23%, тады як негатыўныя ацэнкі рэзка ўзрастаюць да 48%, а доля нейтральных скарачаецца да 22%[8].

Рост негатыўных ацэнак адбываецца найперш за кошт скарачэння нейтральнай пазіцыі. Доля "нейтральных" адказаў падае з 43% да 22% (-21 п.п.), тады як сумарныя негатыўныя ацэнкі павялічваюцца з 22% да 48% (+26 п.п.)[8].

Пасля пачатку вайны негатыўнае ўспрыманне Беларусі замацоўваецца і радыкалізуецца. У сакавіку 2022 года сумарная доля негатыўных ацэнак ужо дасягае 84% ("хутчэй варожая" — 32%, "адназначна варожая" — 52%), пры мінімальнай долі пазітыўных — 4% і 4% нейтральных[9]. Да лютага 2024 года доля негатыўных ацэнак дасягае 90%, прычым рост адбываецца перадусім за кошт катэгорыі "адназначна варожая" (з 52% да 71%), тады як "хутчэй варожая" паступова скарачаецца (з 32% да 19%). Ужо ў першыя месяцы вайны фарміруецца амаль кансэнсуснае негатыўнае ўспрыманне, якое не толькі захоўваецца, але і ўзмацняецца за кошт радыкалізацыі ацэнак.

Гэтыя дадзеныя добра суадносяцца з нашымі вынікамі па палітыцы Украіны ў дачыненні да беларускіх улад. У нашым апытанні таксама бачна, што найбольш жорсткая пазіцыя паступова слабее: доля тых, хто выбірае поўнае спыненне адносін з беларускімі ўладамі, знізілася з 57,91% у 2022 годзе да 26,35% у 2025 годзе. Гэта не азначае вяртання даверу да беларускай дзяржавы, але паказвае пераход ад першапачатковай рэакцыі разрыву да больш дыферэнцыраванага і прагматычнага стаўлення да магчымых фарматаў палітыкі.

***Кіеўскі міжнародны інстытут сацыялогіі.*** У даследаваннях Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі выкарыстоўвалася шкала сацыяльнай дыстанцыі Багардуса, якая дазваляе вымераць ступень гатоўнасці рэспандэнтаў прымаць прадстаўнікоў розных этнічных груп у розных формах сацыяльнага ўзаемадзеяння.

Варта зрабіць адну метадалагічную заўвагу. У апублікаваных на сайце хвалях да 2022 года катэгорыя "беларусы" заставалася неўдакладненай: рэспандэнты маглі мець на ўвазе як грамадзян Беларусі, так і беларусаў, якія пражываюць ва Украіне. Інтэгральны паказчык сацыяльнай дыстанцыі для беларусаў складаў 3,18–3,33, прыкладна паміж узроўнямі "суседзі" і "калегі па працы", што можна інтэрпрэтаваць як умерана пазітыўнае стаўленне[10].

---

8 Сацыялагічная група «Рэйтынг», «Грамадска-палітычныя настроі насельніцтва», 6–8 снежня 2021 г. [https://cdn.prod.website-files.com/685c279caf66f4023ad2cab4/693c1e9af0cb767103346040_rg_ua_2500_122021_press_compressed.pdf]

9 Сацыялагічная група «Рэйтынг», «Пятае агульнанацыянальнае апытанне: Украіна ва ўмовах вайны», 18 сакавіка 2022 г. [https://cdn.prod.website-files.com/685c279caf66f4023ad2cab4/68da49bd0a458a73700a6f32_rg_ua_1000_032022_v_press_compressed.pdf]

10 Кіеўскі міжнародны інстытут сацыялогіі, «Міжэтнічныя прадузятасці ва Украіне», 8–23 верасня 2018 г. [https://kiis.com.ua/?lang=ukr&cat=reports&id=793&page=95]

Пачынаючы з хвалі 2022 года, у даследаванні з'яўляецца падзел катэгорыі "беларусы" на дзве групы: беларусы, якія пражываюць ва Украіне, і беларусы, якія пражываюць па-за яе межамі. Як відаць з апублікаваных хваль 2022, 2024 і 2026 гадоў, вайна ва Украіне і роля Беларусі ў ёй істотна паўплывалі на гэты паказчык для абедзвюх груп. Для беларусаў, якія пражываюць ва Украіне, індэкс склаў 4,37–4,47, тады як для беларусаў, якія пражываюць у Беларусі, 5,34–5,6, што паказвае на значна вышэйшую сацыяльную дыстанцыю ў другім выпадку[11].

Такая дынаміка захоўваецца і ў апытанні, апублікаваным 29.01.2024. Індэкс сацыяльнай дыстанцыі ў дачыненні да беларусаў застаецца высокім. Для беларусаў, якія пражываюць ва Украіне, ён складае 4,37, тады як для беларусаў, якія пражываюць у Беларусі, 5,34, што пацвярджае ўстойлівасць выяўленага разрыву.

Уласнае даследаванне таксама тлумачыць, чаму сацыяльная дыстанцыя захоўваецца: непасрэдныя кантакты з беларусамі мае толькі 7,3% рэспандэнтаў, а каля 60% амаль не сутыкаюцца з матэрыяламі беларускіх аўтараў. Таму стаўленне да беларусаў у значнай ступені фарміруецца не праз асабісты досвед, а праз медыйныя і палітычныя вобразы Беларусі, перадусім праз вайну, залежнасць ад Расіі і ролю беларускіх улад у агрэсіі супраць Украіны.

# Асноўныя высновы

Стаўленне ўкраінцаў да беларусаў пасля пачатку поўнамаштабнай вайны істотна пагоршылася, але з 2022 года застаецца адносна стабільным. Негатыўнае або хутчэй негатыўнае стаўленне характэрнае прыкладна для паловы ўкраінскага грамадства, але адначасова каля траціны рэспандэнтаў захоўваюць станоўчае або хутчэй станоўчае стаўленне да беларусаў. Гэта азначае, што вобраз беларусаў ва Украіне моцна пацярпеў праз ролю беларускай дзяржавы ў вайне, аднак не ператварыўся ў поўны і аднастайны негатыўны кансенсус.

***Фактары пазітыўнага і негатыўнага стаўлення.*** Найбольш выразна стаўленне да беларусаў звязана з узростам, мовай і фінансавым становішчам. Больш пазітыўнае стаўленне часцей характэрнае для старэйшых узроставых груп, рускамоўных і двухмоўных рэспандэнтаў, а таксама людзей з нізкім і сярэднім узроўнем даходу. Рэгіён патрабуе больш асцярожнай інтэрпрэтацыі: у пытанні агульнага стаўлення да беларусаў ён не паказвае самастойнага значэння, бо частка рэгіянальных адрозненняў тлумачыцца моўнай структурай. Аднак рэгіён важны для разумення адрозненняў у палітычных ацэнках Беларусі, Лукашэнкі, залежнасці ад Расіі і магчымых фарматаў кантактаў з беларускай дэмакратычнай апазіцыяй.

***Фактары, якія не тлумачаць стаўленне.*** Асабістыя кантакты з беларусамі і знаёмства з матэрыяламі беларускіх аўтараў не выглядаюць моцнымі фактарамі, якія тлумачаць розніцу ў стаўленні да беларусаў. Пазітыўна настроеныя рэспандэнты сапраўды крыху часцей маюць кантакты з беларусамі, але пераважная большасць нават у гэтай групе такіх кантактаў не мае. Частата сустрэчы з матэрыяламі беларускіх аўтараў фактычна не адрозніваецца паміж пазітыўна і негатыўна настроенымі: рэгулярны кантакт, то бок ад раза ў месяц і часцей, у абедзвюх групах складае 27,8%.

Іншыя правераныя сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі таксама не паказалі істотнага самастойнага ўплыву. Пол, памер населенага пункта, сямейны статус і колькасць дзяцей не

11 Кіеўскі міжнародны інстытут сацыялогіі, «Міжэтнічныя прадузятасці ва Украіне, верасень 2022», 7–13 верасня 2022 г. [https://kiis.com.ua/?lang=ukr&cat=reports&id=1150&page=51]

фарміруюць асобнага профілю пазітыўнага або негатыўнага стаўлення да беларусаў, параўнальнага з узростам, мовай ці фінансавым становішчам.

***Палітычныя ацэнкі і сімпатыі ці антыпатыі да беларусаў.*** Сімпатыя або антыпатыя да беларусаў звязана найперш з тым, наколькі жорстка рэспандэнты ацэньваюць беларускую палітычную сістэму, залежнасць Беларусі ад Расіі і магчымую палітыку Украіны ў дачыненні да беларускіх улад. Негатыўна настроеныя да беларусаў часцей бачаць Беларусь як цалкам аўтарытарную дзяржаву, як дзяржаву пад поўным кантролем Расіі або фактычна акупаваную Расіяй, а таксама часцей падтрымліваюць поўны разрыў адносін з беларускімі ўладамі. Пазітыўна настроеныя таксама ў большасці крытычна ацэньваюць беларускі рэжым і залежнасць ад Расіі, але іх ацэнкі менш катэгарычныя, а ў пытанні палітыкі Украіны яны часцей выбіраюць кампрамісныя або прагматычныя фарматы.

***Беларусь як дзяржава.*** Ва ўкраінскай грамадскай думцы Беларусь успрымаецца перадусім як аўтарытарная і моцна залежная ад Расіі дзяржава. Абсалютная большасць рэспандэнтаў лічыць беларускую палітычную сістэму аўтарытарнай, а знешнюю палітыку Беларусі моцна абмежаванай або фактычна кантраляванай Расіяй. Наратыў пра несамастойнасць Беларусі можа часткова зніжаць адказнасць беларусаў як грамадства за дзеянні рэжыму, але адначасова ставіць пад пытанне палітычную суб’ектнасць Беларусі і беларусаў. Невялікая доля рэспандэнтаў усё яшчэ лічыць Беларусь незалежнай дзяржавай, аднак гэтая пазіцыя застаецца маргінальнай.

***Беларуская палітыка і палітыка Украіны.*** Украінцы ў большасці не прызнаюць Аляксандра Лукашэнку легітымным кіраўніком Беларусі, аднак у параўнанні з 2022 годам гэтая пазіцыя стала менш катэгарычнай. Адначасова зніжаецца вядомасць Святланы Ціханоўскай і беларускіх узброеных фармаванняў, якія ваююць на баку Украіны. У пытанні палітыкі Украіны ў дачыненні да беларускіх улад назіраецца адыход ад першапачатковай жорсткай лініі поўнага разрыву: доля тых, хто падтрымлівае такую пазіцыю, істотна скарацілася. У дачыненні да беларускай дэмакратычнай апазіцыі грамадская думка хутчэй падтрымлівае развіццё кантактаў, але пераважна ў абмежаваных, сімвалічных, афіцыйна стрыманых або непублічных фарматах. Падтрымка адкрытага і ўсебаковага супрацоўніцтва застаецца адносна невялікай.

***Культурны вакуум.*** Беларуская культура і гісторыя слаба прадстаўленыя ва ўкраінскай грамадскай свядомасці. Большасць рэспандэнтаў не ведае ніводнага з прапанаваных беларускіх культурных, гістарычных або палітычных дзеячаў. Найбольш вядомым з’яўляецца Кастусь Каліноўскі, але гэта, хутчэй за ўсё, звязана не з веданнем гісторыі паўстання XIX стагоддзя, а з дзейнасцю палка Каліноўскага ў сучаснай вайне. Вядомасць класікаў беларускай літаратуры і сучасных аўтараў застаецца нізкай. Гэта паказвае, што Беларусь для значнай часткі ўкраінцаў існуе перадусім як дзяржава, а не як культурная з’ява.

***Параўнанне з украінскімі даследаваннямі.*** Дадзеныя іншых украінскіх сацыялагічных службаў пацвярджаюць агульны маштаб негатыўнага зруху ў стаўленні да Беларусі пасля пачатку поўнамаштабнай вайны. Аднак даследаванне “Палітычнай сферы” дазваляе ўбачыць больш складаную карціну: стаўленне да Беларусі як дзяржавы, да беларускіх улад і да беларусаў як грамадзян не супадае цалкам. У даследаваннях, дзе пытанне задаецца пра Беларусь як краіну, негатыўнае стаўленне дасягае значна больш высокіх паказчыкаў. Калі ж гаворка ідзе пра беларусаў як грамадзян, негатыў застаецца вельмі значным, але не становіцца поўным кансенсусам. Гэта пацвярджае, што частка ўкраінцаў працягвае адрозніваць беларускую дзяржаву і беларускае грамадства, нават ва ўмовах вайны і вельмі негатыўнага агульнага фону.